**218.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы.

1) Сябры, пайшлі, з, радасць, каток, на; 2) бабуля, мазь, змазала, рука; 3) мама, на, глядзела, з, дачушка, любоў; 4) чайка, над, лётаюць, Нарач.

Вызначце склон назоўнікаў 3-га скланення, абазначце канчаткі.

**219.** Спішыце. Назоўнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

Пасля доўгай зімняй *(ноч)* наступіла марозная раніца. Неба залілося яркай *(чырвань)*. Лёгкі вецер дыхнуў марознай *(свежасць)*. Хлопчыкі змазалі лыжы *(мазь)* памчаліся па снежнай *(гладзь)*. Перад імі адкрылася снежная *(даль)* ва ўсёй *(прыгажосць)*.

Знайдзіце ў тэксце сказ з аднароднымі членамі. Правільна афарміце яго на пісьме.

## Скланенне назоўнікаў у множным ліку

**220.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце іх тып скланення.

Каза, пятля, поле, алень, рэч, гусь, пчала, вішня, гай, вадзіцель, печ, рысь.

Утварыце і запішыце формы множнага ліку прапанаваных назоўнікаў. Выдзеліце ў іх канчаткі. На якія пытанні адказваюць запісаныя назоўнікі?

?! Якія канчаткі маюць назоўнікі множнага ліку ў назоўным склоне?

**221.** Разгледзьце табліцу. Параўнайце канчаткі ў назоўніках множнага ліку ў розных склонах.

| Склон | Назоўнікі ў множным ліку | | |
|---|---|---|---|
| | **1-е скл.** | **2-е скл.** | **3-е скл.** |
| **Н.** | *коз[ы], петл[і]* | *пал[і], ален[і]* | *рэч[ы], гус[і]* |
| **Р.** | *коз[ ], петл[яў]* | *пал[ёў], ален[яў]* | *рэч[аў], гус[е́й]* |
| **Д.** | *коз[ам], петл[ям]* | *пал[ям], ален[ям]* | *рэч[ам], гус[я́м]* |
| **В.** | *коз[ ], петл[і]* | *пал[і], ален[яў]* | *рэч[ы], гус[е́й]* |
| **Т.** | *коз[амі], петл[ямі]* | *пал[ямі], ален[ямі]* | *рэч[амі], гус[я́мі]* |
| **М.** | *(пры) коз[ах], (на) петл[ях]* | *(у) пал[ях], (на) ален[ях]* | *(у) рэч[ах], (пры) гус[я́х]* |

Калі супадаюць канчаткі ў назоўніках множнага ліку ў назоўным і вінавальным склонах? У родным і вінавальным склонах?

Вусна праскланяйце назоўнікі множнага ліку *пчолы, вішні, гаí, вадзіцелі, печы, рысі.* Выкарыстайце ўзор скланення слоў, прапанаваны ў табліцы (*пчолы → козы, вішні → петлі, гаі → палі, вадзіцелі → алені, печы → рэчы, рысі → гусі).*

**Калі назоўнік множнага ліку адказвае на пытанне к т о?, то ён мае аднолькавыя канчаткі ў формах роднага і вінавальнага склонаў. Калі ён адказвае на пытанне ш т о?, то мае аднолькавыя канчаткі ў формах назоўнага і вінавальнага склонаў.**



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**222.** Прачытайце. Выпішыце тыя сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца дадзенымі членамі сказа. Пазначце склон гэтых назоўнікаў. Абазначце ў іх канчаткі.

1. Снег засыпаў **палі**. За вёскай раскінуліся шырокія **палі**. 2. Дзяніс паклаў у рукзак патрэбныя **рэчы**. Усе **рэчы** ляжаць на сваіх месцах. 3. Мама зачыніла **дзверы**. Адчыненыя **дзверы** ціха пары́пвалі.

У якім склоне ўжыты выдзеленыя словы ў астатніх сказах?

**?!** Як можна адрозніць формы назоўнага і вінавальнага склонаў назоўнікаў множнага ліку ў сказах?

**223.** Утварыце формы слоў па ўзоры.

*мінчанін* — *мінчан*[*е*]
гараджанін — …
гамяльчанін — …
бабруйчанін — …

**гараджа́не**

Дагаварыце сказы.

У Мінску жывуць мінчане. У Бабруйску … … . У Гомелі … … . У горадзе … … .

Запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

Вызначце склон назоўнікаў множнага ліку. Абазначце ў іх канчаткі.

Назоўнікі множнага ліку ў назоўным склоне маюць канчаткі ***-і, -ы, -е***.

**224.** Прачытайце верш. Каго называюць юнымі мінчанамі? Чаму Мінск — асаблівы горад для ўсіх жыхароў Беларусі?

### Юныя мінчане



Знаёмцеся: мы гараджане.
Наш горад расце ў добры час.
Завёмся мы проста — мінчане.
І Мінск найдаражшы для нас.

*Н. Галіноўская.*

Выпішыце сказы, у якіх ёсць назоўнікі множнага ліку. Вызначце склон гэтых назоўнікаў.

**Рм** Які горад, пасёлак або вёска самыя дарагія для вас? Чаму?

***Творчая хвілінка***

Уявіце, што да вас прыехалі сваякі або добрыя знаёмыя з іншай краіны. Вы вырашылі паказаць ім Мінск. Раскажыце, якія месцы ў нашай сталіцы вы наведалі б з гасцямі. Чаму вы выбралі б менавіта іх?

**225.** Спішыце тэкст. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь. Гэты горад з’яўляецца прамысловым і транспартным цэнтрам. Тут ёсць метро чыгуначны і аўтобусныя **вакзалы.** На заводах рабочыя вырабляюць **машыны** будаўнічыя **матэрыялы** электронныя **прыборы.** У Мінску працуюць **тэатры кінатэатры** і **музеі. Гараджане** і **госці** сталіцы наведваюць **паркі** спартыўныя **комплексы.**

Вызначце склон выдзеленых назоўнікаў.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

## Родны склон

**226.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце іх тып скланення.

Чарэшня, аловак, вежа, баравік, ноч, вучань, рэч, корань, даль.

Утварыце формы множнага ліку ад прапанаваных назоўнікаў і запішыце іх у тры слупкі па ўзоры.

| Узор: | 1-е скл., мн. л. | 2-е скл., мн. л. | 3-е скл., мн. л. |
|---|---|---|---|
| | *чарэшні* | *вёдры* | *ночы* |
| | … | … | … |

**227.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў. Назавіце іх канчаткі.

назбіралі чарэшань
нарвалі чарэшняў
не засталося веж
не рабілі вежаў

не прынеслі алоўкаў
не знайшлі баравікоў
не бачыла вучняў
не пакінулі каранёў

некалькі начэй
шмат рэчаў
даносіцца з да́ляў
чуецца з да́лей

Якія канчаткі маюць у родным склоне назоўнікі множнага ліку 1-га скланення? 2-га скланення? 3-га скланення?

У родным склоне назоўнікі множнага ліку маюць канчаткі ***-аў, -яў, -оў, -ёў, -эй, -ей*** і **нулявы** канчатак.

Назоўнікі 1-га скланення маюць канчаткі ***-аў, -яў*** і нулявы канчатак. Некаторыя з іх маюць варыянты канчаткаў: *вежы — веж*☐, *веж*[*аў*].

Назоўнікі 2-га скланення маюць канчаткі ***-аў, -яў, -оў, -ёў***. Радзей яны маюць канчаткі ***-эй, -ей***: *вуш*[*эй*], *гасц*[*ей*].

Назоўнікі 3-га скланення маюць канчаткі ***-эй, -ей, -аў, -яў***. Некаторыя з іх маюць варыянты канчаткаў: печы — *пе́ч*[*аў*], *пяч*[*эй*].

**228.** Пастаўце назоўнікі множнага ліку ў форму роднага склону па ўзоры. Абазначце ў іх канчаткі.

*Вішн*[*і*] — *вішань*☐, *вішн*[*яў*], завеі — ..., ...; *бабул*[*і*] — *бабуль*☐, кашулі — ...; *сасн*[*а*] — *сосен*☐, *сосн*[*аў*], секунды — ..., ... .

*Бот*[*ы*] — *бот*[*аў*], палёты — ...; *баршч*[*ы*] — *баршч*[*оў*], лясы́ — ...; *вугл*[*і́*] — *вугл*[*ёў*], ласі — ...; *пако*[*і*] — *пако*[*яў*], заданні — ...; *воч*[*ы*] — *вач*[*эй*], вушы — ...; *госц*[*і*] — *гасц*[*ей*], коні — ... .

*Ноч*[*ы*] — *нач*[*эй*], мышы — ...; *да́леч*[*ы*] — *да́леч*[*аў*], рэчы — ...; *лан*[*і*] — *лан*[*ей*], *лан*[*яў*], далоні — ..., ... .

Са слоўнікавым словам прыдумайце і запішыце сказ. Вызначце склон назоўніка *секунда* ў сказе. Абазначце ў ім канчатак.

**секу́нда**

**Гаварыце правільна!**

Коні — па́свіў ко́н**ей**, ласі́ — кармілі лас**ёў**, дочкі — адвёз дач**о́к** у вёску, сыны́ — сустрэла сын**оў**, бацькі́ — паважаць бацьк**оў**.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**229.** Запішыце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў множнага ліку.

Праца дзяўчынак, сустрэлі дзяўчынак; даглядаў коней, збруя коней; лавіў мышэй, не было мышэй; сустрэча настаўніц, павіншавалі настаўніц.

**?!** Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як вызначыць склон гэтых назоўнікаў.

Падказка: *праца* (к а г о?) ***дзяўчынак*** — *праца* (к а г о?)

Р. Р.

***мамы*** → ***дзяўчынак***; *сустрэлі* (к а г о?) ***дзяўчынак*** — *сустрэлі* (к а г о?) ***маму*** → ***дзяўчынак***.

В. В.

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце сказ.

**230.** Прачытайце верш. Словы ў дужках пастаўце ў форму роднага склону.





**Родныя мясціны**

Бярозкі белыя
і вогнішча рабіны,
блакіт азёр,
*(лугі)* мурог.
Дамоў вяртаюць
родныя мясціны
з усіх *(краіны)*,
з усіх *(дарогі)*.

*Я. Жабко.*





Спішыце. Абазначце канчаткі ў назоўніках, форму якіх вы змянілі. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у апошнім сказе.

## Давальны і творны склоны

**231.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў множнага ліку. Назавіце іх канчаткі.

радаваўся (ч а м у?) канікулам
віншаванне (к а м у?) матулям
задаволены (ч ы м?) канікуламі
адпачывалі (з к і м?) з матулямі

Якія канчаткі маюць назоўнікі множнага ліку ў давальным склоне? У творным склоне?

Назоўнікі множнага ліку ў давальным склоне маюць канчаткі ***-ам, -ям***, а ў творным склоне — ***-амі, -ямі***.

**232.** Утварыце спалучэнні слоў па схемах і запішыце іх.

| *мн. л., Т.* <br> *дзеяслоў + **пад** + назоўнік* | *адз. л., Н. мн. л., Д.* <br> *назоўнік + назоўнік* |
|---|---|
| схаваліся пад *(ясені)* | падзяка *(вучні)* |
| сустрэліся пад *(дрэвы)* | падарунак *(сыны)* |
| ляжыць пад *(рукі)* | слава *(воіны)* |
| убачыў пад *(ногі)* | прывітанне *(людзі)* |

**233.** Прачытайце. Вызначце лік і склон выдзеленых назоўнікаў. Выпішыце тыя сказы, у якіх гэтыя назоўнікі ўжыты ў форме давальнага склону.

1. Тата купіў **сына́м** канькі. Тата з **сы́нам** запусцілі паветранага змея. 2. Мы з **бра́там** хадзілі ў кіно.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Брата́м** спадабаўся бабулін сабачка. 3. Алеся зрабіла падарункі **сябра́м**. Паўлік гуляў на вуліцы з **ся́брам.**

Абазначце канчаткі ў назоўніках у давальным склоне.

**Гаварыце правільна!**

Даў ко́ням, любаваўся ко́нь**мі**, параіўся з людзь**мі́**, павёў пляч**а́мі** (пляч**ы́ма**), абвёў вач**а́мі** (вач**ы́ма**), расплаціўся граш**а́мі** (граш**ы́ма**).

**234.** Прачытайце верш. Які час апісваецца ў ім? Што нагадваюць пралескі паэту? Чым, на яго думку, пахнуць гэтыя кветкі?



Паміж ручаямі і ліўнямі,
паміж маразамі і спёкамі
праходзіць граніца дзіўная —
наіўная, блакітнавокая.

Граніца з пралесак сплецена:
пралескі пускаць не павінны
зімовых завей да квецені,
снегу да зеляніны.

Ды — хочаш не хочаш — сыходзяцца:
не лічацца вёсны з граніцаю!
І пахнуць пралескам даводзіцца
марозам і навальніцамі.

*Я. Сіпакоў.*

Выпішыце з верша першы і апошні сказы. Знайдзіце ў іх назоўнікі. Вызначце іх лік і склон.

**235.** Прачытайце тэкст. Якія жывёлы любяць паласавацца грыбамі?

### Ама́тары грыбоў

**Ці знаёмы вам лясныя жыхары, якія грыбы любяць?**

**В..домымі грыбнікамі лічацца вавёркі. Улетку гэтыя зв..ркі часта грыбамі ласуюцца.**

**Неабыякавыя да грыбоў і мядзведзі. Для іх усе грыбы прыдатныя. Не захапляюцца яны толькі мухаморамі ды белымі паганкамі.**

**Пераспелымі абабкамі, падасінавікамі цікавяцца н..каторыя птушкі. Яны прываблiваюцца жучкамі, чарвячкамі, якія пас..ляюцца ў грыбах.**

**Вожыкам падабаюцца маладыя грыбкі.**

**Што і казаць, смачны пачастунак!** *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

Выпішыце сказы, у якіх ёсць назоўнікі множнага ліку ў форме давальнага і творнага склонаў. Устаўце патрэбныя літары на месцы пропускаў.

## Месны склон

**236.** Прачытайце спалучэнні слоў. Вызначце склон назоўнікаў множнага ліку.

засумавалі (п а к і м?) па сябрах
шуміць (у ч ы м?) у дрэвах
сумавалі (п а к і м?) па дзецях
ездзяць (п а ч ы м?) па палях

Назавіце канчаткі, якія маюць у месным склоне назоўнікі множнага ліку.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**Назоўнікі множнага ліку ў месным склоне маюць канчаткі *-ах, -ях.***

**237.** Утварыце спалучэнні слоў па схемах і запішыце іх.

| *мн. л., М.*<br>*дзеяслоў* + ***па*** + *назоўнік* | *адз. л., Н.* *мн. л., М.*<br>*назоўнік* + ***па*** + *назоўнік* |
|---|---|
| гулялі па *(сцежкі)* | апавяданне па *(малюнкі)* |
| спалі па *(ночы)* | пераказ па *(пытанні)* |
| сумавалі па *(прыя́целі)* | сачыненне па *(назіранні)* |

З адным спалучэннем слоў складзіце і запішыце сказ.

**Будзьце ўважлівыя!**

| **у беларускай мове** | **у рускай мове** |
|---|---|
| гулялі па вуліцах *(М.)* | гуляли по улицам *(Д.)* |
| сумавалі па дзецях *(М.)* | скучали по детям *(Д.)* |

**238.** Прачытайце. Пастаўце пытанні да выдзеленых назоўнікаў. Вызначце іх лік і склон.

1. Верачка сумавала па бабуліных **казках.** Унукі захапляліся **казкамі** дзядулі. 2. Мама і дзеці любаваліся блакітнымі **азёрамі.** Турысты выправіліся ў падарожжа па Браслаўскіх **азёрах.**

Выпішыце тыя сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі ўжыты ў форме меснага склону. Абазначце ў іх канчаткі.

***Творчая хвілінка***

Якімі азёрамі славіцца Беларусь? Раскажыце пра тыя азёры, на якіх вы пабывалі. Пры неабходнасці знайдзіце цікавыя звесткі пра іх у інтэрнэце.

**239.** Прачытайце прыказкі. Пастаўце назоўнікі ў дужках у форму множнага ліку меснага склону. Чаму так гавораць?

1. **Па** *(кветкі)* яблыкаў **не** лічы. 2. **У** *(ногі)* пра**ў**ды няма.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар і слоў. Запішыце прыказкі па памяці. Абазначце канчаткі ў назоўніках у месным склоне.

**240.** Прачытайце верш. Якая прыродная з'ява апісваецца ў ім?



Белыя паляны, белыя гаі...
Пчолы л..дзяныя кружацца ў галлі,
кружацца раямі, сыплюцца на дол,
апушы́лі хвоек срэбраны прыпол.
А з-за лесу-гаю скача па лугах
хтосьці незнаёмы ў л..дзяных санях.

*Т. Кляшторны.*

Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце патрэбныя літары.

Знайдзіце ў запісаных сказах назоўнікі множнага ліку. Вызначце іх склон.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

*Адкажыце на пытанні*

1. Як называецца змяненне назоўнікаў па пытаннях?
2. Колькі склонаў у беларускай мове? Пералічыце склонавыя пытанні назоўнікаў.
3. Якую ролю ў сказе выконвае назоўнік у назоўным склоне?
4. Якія назоўнікі адносяцца да 1-га скланення?
5. Якія назоўнікі адносяцца да 2-га скланення?
6. Якія назоўнікі адносяцца да 3-га скланення?

*Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Назоўнік у беларускай мове». Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з наступных тэм: «Змяненне назоўнікаў па склонах. Тыпы скланення», «Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі», «Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі», «Назоўнікі 3-га скланення, іх канчаткі», «Скланенне назоўнікаў у множным ліку».

Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах.

## Слоўнікавыя словы

| | | |
|---|---|---|
| ах**во́**тна | г**ры**ме́ць | се**ку́**нда |
| бал**е**ры́на | л**е́дзьв**е | **сё**нн**я** |
| бер**э́**т | ме́**нш**ы | тэлеграма |
| **ву́**ліца | па**шт**альён | **у**ле́тку |
| гара**дж**а́не | пл**ы**ве́ц | |